напісанні і афармленні дзіцячай кнігі з бездакорным адчуваннем дзіцячага светапогляду» ўручылі залаты медаль.

✓**«Беларускамоўныя»** – штотыднёвы праект «Арт Сядзібы» ў межах года Беларускай мовы і кампаніі «Беларускамоўны». Кожную сераду ў госці прыходзяць па два носьбіты беларускай мовы, каб падзяліцца сваёй гісторыяй пераходу на яе. Пад час гутаркі ім задаюць пытанні як вядоўца Бася Пучынская, так і наведнікі. **3 красавіка** былі запрошаныя юрыстка Дар’я Шумілава і юрыст, заснавальнік грамадзянскай ініцыятывы «УМОВЫ для МОВЫ» Ігар Случак.

✓**3 красавіка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыўся **фартэпіянны міні-канцэрт «Вяртаем забытыя імёны», прысвечаны творчасці кампазітара XIX ст. Гедыміна Радкевіча**. Ноты з творамі Г. Радкевіча былі знойдзеныя ў Польшчы. Нашчадкі кампазітара перадалі іх у пасольства Беларусі ў Польшчы. Цяпер копіі гэтых нотаў трапяць у фонды Беларускага дзяржаўнага літаратурнага музея.

Прэзентацыю рэдкіх твораў Г. Радкевіча правёў піяніст і даследчык музычнай спадчыны Гродзеншчыны Уладзімір Лябецкі. Сярод гасцей мерапрыемства былі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, шэрагу пасольстваў у Беларусі, кіраўнікі музеяў і іншых культурных установаў краіны.

Г. Радкевіч (1834 – 1891) – прадстаўнік знатнага старажытнага шляхецкага роду (герб «Побуг»), паходзіў з арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага, быў найбуйнейшым землеўладальнікам на Віленшчыне. Ідэнтыфікаваў сябе літвінам, падкрэсліваючы старажытнасць і шляхетнасць сваіх продкаў. Атрымаў акадэмічную музычную адукацыю ў Еўропе.

Музычная спадчына, вядомая сёння, прадстаўленая выключна фартэпіяннымі творамі, у асноўным мініяцюрамі – вальс, галоп, мазурка, полька, што з’яўляецца сведчаннем яго бліскучай адукацыі як піяніста.

✓**4 – 5 красавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся юбілейныя **XV Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні**. Цягам двух дзён прайшлі пленарнае пасяджэнне, 7 секцыяў і адкрыццё выстаўкі «Захавальнікі рарытэтаў». Арганізатары – Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і НББ. Партнёрамі выступілі Польскі інстытут у Мінску і праект Еўрапейскага саюза MOST. У мерапрыемствах узялі ўдзел вучоныя з Беларусі, Вялікабрытаніі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны. Чытанні аб’ядналі кнігазнаўцаў, бібліятэкараў, гісторыкаў, філолагаў, культуролагаў і філосафаў, якія прадставілі вынікі самых новых даследаванняў па гісторыі рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны.


Адкрыццё выстаўкі «Захавальнікі рарытэтаў»

У першы дзень адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі «Захавальнікі рарытэтаў», што падрыхтаваная ў Музеі кнігі НББ да 40-годдзя яе навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства. Выстаўка – даніна павагі руплівцам, якія зберагаючы найлепшыя традыцыі мінулага, захоўваюць і памнажаюць кніжную спадчыну нацыі.

У другі дзень канферэнцыі адбываліся секцыйныя пасяджэнні, пад час якіх ажыццяўляўся абмен навуковымі распрацоўкамі і ідэямі, абмен думкамі аб ключавых напрамках і перспектывах развіцця кнігазнаўства.

Пры падвядзенні вынікаў было адзначана, што кнігазнаўчыя чытанні даўно сталі адным з найважнейшых мерапрыемстваў, унікальнай пляцоўкай, дзе адбываецца абмен меркаваннямі паміж даследчыкамі з розных краінаў свету. Асноўным аб’ектам даследавання з’яўляецца менавіта кніжная спадчына Беларусі, якая ў сваіх розных аспектах уключае і нацыянальную самабытнасць, і еўрапейскую культурную традыцыю, і найлепшыя здабыткі сусветнай цывілізацыі.

✓**4 красавіка** ў Арт-гасцёўні «Высокае мѣста» адкрылі **выставачны праект чэшскага дызайнера «Павел Нага – плакат»**. Ён арганізаваны сумесна з Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжам імя А. Глебава, пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Чэхія ў Рэспубліцы Беларусь. П. Нага з 1996 года працуе як графічны дызайнер. Ён прафесар, аўтар мноства артыкулаў па графічным дызайне і некалькіх падручнікаў па тыпаграфіцы, камп’ютарнай графіцы, сістэмах візуальных знакаў і гісторыі графічнага дызайну. Экспануюцца больш за 30 плакатаў, што адлюстроўваюць разнастайныя культурныя мерапрыемствы.